На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 10 (132)
Субота, 18 студзеня 1997 г.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах
Кошт: у кіёсках і кромах — 1500 руб. у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

18 студзеня
Усход Сонца — 8.48
Заход Сонца — 16.32
Даўжыня дня — 7.44
Першая чвэрць Месяца 15 студзеня
12 гадз 53 мін Месяц у Цяльцы

Прыемна!

Упершыню выдадзены 22 песні Станіслава Манюшкі на вершы Яна Чачота

У пачатку траўня 1819 года ў дом Альжбеты і Чэслава Манюшкаў уляцела ластаўка і пачала ляпіць гняздо над калыскаю іх сына Станіслава. Гэта быў асаблівы знак яго кампазітарскага прызначэння.

...Сёлета споўнілася 200 гадоў з дня нараджэння аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры Яна Чачота.

А ў сярэдзіне студзеня ў Беларускім таварыстве дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі адбылася прэзентацыя зборніка Станіслава Манюшкі на тэксты Яна Чачота "Песні з-над Нёмна і Дзвіны".

Упершыню пасля смерці Станіслава Манюшкі выходзяць з друку творы кампазітара на яго радзіме.

Упершыню сабраны і выдадзены ўсе 22 песні Манюшкі на вершы Чачота.

Упершыню гэтыя песні вернуты працаю перакладчыкаў да свайго першагуку - беларускага слова.

Упершыню мы маем навуковы каментар да твораў Манюшкі, зроблены Уладзімірам Мархелем і кіраўніком "Беларускай капэлы" Віктарам Скарабагатавым.

На вечары "Песні з-над Нёмна і Дзвіны" выконвалі Віктар Скарабагатаў, Рыгор Паляшчук, Алена Бундзелева і Леся Лют.

Чачот марыў пра час, калі яго творы, узятыя ў беларускага народа, будуць пакладзены на музыку і ў адноўленым стане вернуцца да свайго першастваральніка. Так і здарылася...

Ганна СОУСЬ.

Чулі?

Андрэй Сікорскі вяртаецца ў Мінск

Быў час, калі беларускую музычную моладзь, нібыта магнітам, цягнула ў Маскву. Скончыўшы школу ці нават кансерваторыю, нашы піяністы марылі "ўдасканаліцца" ў тамтэйшых прафесароў. Нехта шчыра верыў, што цудадзейная моц маскоўскіх магаў зробіць з іх геніяў. Але галоўным чынам гаворка ішла пра справы практычныя: каб трапіць на міжнародны конкурс, трэба было вучыцца ці ў Маскве, ці хаця б у Пецярбургу. Так было, пакуль існаваў гэтак званы "ўсесаюзны адбор".

На жаль, усе паездкі ў Маскву заканчваліся не тое што дрэнна, прасцей кажучы — ніяк. Геніем не стаў ніхто, а лаўрэатамі (з дзесяткаў нашых!) зрабіўся толькі Эдуард Міянсараў.

У 1993 годзе да яго далучыўся Андрэй Сікорскі, здабыўшы Гран-пры на Міжнародным конкурсе піяністаў імя Дж.Б.Віоці ў Верчэлі (Італія). Ды якая карысць у найцудоўнейшай перамозе, калі галоўнае, чаго ад цябе патрабуюць, — гэта гнуткасць пазваночніка!.. Андрэй не пажадаў жыць па тых брудных правілах, паводле якіх існуе сённяшняя Маскоўская кансерваторыя. І ў выніку ён застаўся за бортам. Зрэшты, гэта было яшчэ не горшае выпрабаванне ў ягоным расійскім жыцці...

І вось, нарэшце, ён вяртаецца на радзіму. "Мы з задавальненнем мелі б у Мінску гэткага музыканта", — гаворыць мастацкі кіраўнік Беларускай філармоніі Юры Гільдзюк. — Не таму, што гэта мой вучань; але такі чалавек — як некалі Ігар Алоўнікаў — будзе значным чынам уплываць на ўсю аўру, на цэлае пакаленне маладых выканаўцаў".

Наша гутарка адбылася ў сярэдзіне лістапада — адразу пасля заканчэння Першага міжнароднага конкурсу "Мінск-96. Фартэпіяна", на якім Андрэй зноў заваяваў Гран-пры. Ягоная перамога была відавочнай і бясспрэчнай: публіка прымала яго з надзвычайным энтузіязмам — нягледзячы нават на тое, што выступаў ён пад расійскім сцягам. Зрэшты, нашая публіка не пакутуе на залішні патрыятызм.

Але конкурс — конкурсам: хвалюючая атмасфера спаборніцтва, натоўп слухачоў, зацікаўленых не так музыкай, як барацьбой вакол узнагарод. У параўнанні з "сярэднім" канкурсантам кожны лаўрэат, і асабліва "свой", здаецца геніем. Цалкам іншая справа — сольны канцэрт. Паўтары гадзіны ў вялікай зале, сам-насам з публікай — вось сапраўдны экзамен для музыканта! І напрыклад, Юзэф Сяргей — лаўрэат другой прэміі сёлетняга конкурса — вытрымаў яго зусім не на "выдатна". Не хапіла індывідуальнасці.

Менавіта з гэтым у Андрэя Сікорскага ўсё ў парадку. Ад яго зыходзіць святло, цеплыня і радасць. І хоць ягоны сольны канцэрт, што адбыўся 25 снежня, выклікаў у спецыялістаў і аматараў музыкі шмат спрэчак, асабіста я ўжо ўпэўнена віншую вас з каштоўным набыткам, бо такі музыкант не з'яўляецца кожны дзень. Нават у нас, дзе зямля шчодра нараджае таленты.

Юлія АНДРЭЕВА.

Страсти вокруг "Сэкая"

Прокуратура республики продлила срок содержания под стражей директора компании "Сэкай" Валерия Буяка.

Более трех лет назад на финансовом рынке Беларуси появилась компания "Сэкай". Основным видом ее деятельности являлось привлечение вкладов от населения под проценты.

Доверчивых граждан оказалось не так уж мало: более трех тысяч минчан захотели пусть хоть чуточку, но разбогатеть. И поначалу, как и должно было быть, дела фирмы шли неплохо. Было довольно руководство компании, не имели к ней никаких претензий займодатели. Но в один прекрасный момент получить свои вклады они не смогли. Несложно догадаться, какие объяснения растерявшимся гражданам дало руководство фирмы. Кто-то поверил в то, что компания действительно переживает временные трудности, кто-то обвинил ее директора в мошенничестве.

В городскую прокуратуру стали поступать заявления от вкладчиков с просьбой помочь получить обратно свои деньги. У "Сэкая" начались времена бесконечных проверок. Несколько раз арестовывали директора компании Валерия Буяка, которого, правда, спустя некоторое время освобождали. Но в апреле прошлого года его арестовали и, предъявив обвинение в нарушении порядка осуществления предпринимательской деятельности по статье 151 Уголовного кодекса Республики Беларусь, уже не выпустили. В декабре в процессе следствия к этой статье добавилась еще одна — 91-я, которая предусматривает содержание обвиняемого под стражей в период предварительного следствия сроком до полутора лет.

Отношение вкладчиков к директору компании неоднозначно. Они разделились на две группы. Одна поддерживает Буяка и верит, что, как только его освободят, он вернет деньги, вторая требует его немедленного наказания. Сам Валерий Буяк считает свое задержание незаконным. В декабре прошлого года он объявлял голодовку и даже назначал дату своего самоубийства. Но, к счастью, все обошлось.

Верящие директору вкладчики настойчиво требуют освободить Буяка из-под стражи. В "Народную волю" они написали: "Г-н Буяк за все годы своей работы в системе "Сэкай" не обманул ни единого займодателя, всегда честно, четко и вовремя рассчитывался со своими клиентами. Он абсолютно прав, говоря:"Или меня выпустят на свободу и я рассчитаюсь со всеми займодателями, или отсюда вынесут мой труп". А 8 января несколько человек пикетировали здание республиканской прокуратуры в защиту Буяка. Кстати, разрешение на проведение пикета с 1 января по 1 марта дал Минский горисполком.

Законно ли арестован Валерий Буяк? С этим вопросом я обратилась в следственный комитет Министерства внутренних дел республики, где и идет расследование по делу директора компании "Сэкай".

Основания содержать Валерия Буяка под стражей, считают в комитете, есть. На предварительном следствии установлено, что часть денег компании незаконно переведена за границу, что во время ее деятельности имели место эпизоды мошеннического завладения деньгами граждан. Кроме того, у следствия вызывает сомнение тот факт, что Буяк может вернуть вкладчикам деньги. Не исключают в комитете и того, что, оказавшись на свободе, директор "Сэкая" убежит из Беларуси.

Сегодня следствие продолжается. Виновен ли Валерий Буяк, может решить только суд. Когда он состоится, пока неизвестно. Не так давно в прокуратуре республики было принято решение о продлении срока содержания под стражей директора "Сэкая" на год.

Мария ЭЙСМОНТ.

Месца сустрэчы змяніць нельга...

Днямі каля пяцідзесяці чалавек рознага ўзросту стаялі ў пікеце ля амбасады Расіі ў Мінску. Па няпісанаму закону дыпламатыі да пікетчыкаў абавязкова павінен выйсці хто-небудзь з кіраўніцтва амбасады. Але ж да прадстаўнікоў БНФ ніхто не выйшаў.

Як паведаміў прэс-сакратар фронту В.Буйвал, трох чалавек пасля пікетавання "ўзялі" людзі ў цывільным. Іх адразу ж адвезлі ў Цэнтральны суд, дзе хуценька асудзілі. Сябра БНФ Ігара Лазарчука, напрыклад, асудзілі за тое, што ў час пікетавання ён трымаў плакат "Расея заваюе Беларусь рукамі Лукашэнкі" і "нецэнзурна выказваўся". Ад апошняга спадар Лазарчук адмаўляецца, аднак гэта не перашкодзіла ўладзе прысудзіць яму штраф у 200 тысяч рублёў. Іншаму ўдзельніку пікета Віктару Фурману такім жа чынам трэба было выкласці ў судзе 500 тысяч рублёў. Трэцяга, Андрэя Жарнасека, які нават не прысутнічаў на акцыі, злавілі каля ўправы БНФ. Аднак пасля таго як у пастарунку прагледзелі стужку КДБ, знятую на пікеце, спадара Жарнасека давялося выпусціць.

Марына РАССАФОНАВА.

Неожиданный ракурс

Ельцин — Лукашенко: просто переписка?

Не надо волноваться относительно обращения президента Ельцина к Александру Лукашенко, сообщили нам в белорусском Министерстве иностранных дел, поскольку этот документ, наделавший столько шума в демократических кругах Беларуси, оказался обычным рабочим ответом на такое же обращение белорусского президента. С посланием к Ельцину Александр Лукашенко обратился несколько ранее, но оно не предавалось широкой огласке.

В МИДе полагают, что письмо Ельцина — нормальное следование двусторонней программе, благодаря которой президент России предлагает синхронизировать экономические реформы, унифицировать таможенные комплексы обеих стран и сместить центр тяжести нашего сотрудничества в сферу производства. Но он никоим образом не инициирует проведение всенародного плебисцита в России и Беларуси по вопросу создания новой государственной формы.

Как известно, в своем выступлении в Госдуме Александр Лукашенко предложил воплощать в жизнь интеграционные инициативы на межпарламентском уровне. А это значит, что Госдума может собрать 2 миллиона голосов российских граждан для того, чтобы принять решение о проведении такого референдума в России. Правда, белорусский президент якобы не склонен к такой форме решения вопроса. Может, просто не осталось денег на еще один референдум? Или боится потерять государство Беларусь и свой президентский пост? А в Кремле-то и своих вождей хватает...

Марина РАССАФОНОВА.

Генадзь Самойленка хвалюецца за лёс беларускай дэмакратыі

Член нацыянальнага камітэта Аб'яднанай грамадзянскай партыі Генадзь Самойленка, які звярнуўся да польскага прэзідэнта Квасьнеўскага з просьбай прадаставіць яму палітычны прытулак (аб чым "Народная воля" ўжо пісала), па-ранейшаму чакае адказу. Разам з тым спадар Самойленка, відаць, вырашыў крыху патурбаваць мясцовую ўладу. Нядаўна ён звярнуўся да брэсцкага "вертыкальшчыка" Уладзіміра Заламая, старшыні гарвыканкома Генадзя Масько і пракурора вобласці. У сваёй заяве Генадзь Самойленка выказвае незадавальненне палітычнай сітуацыяй у Беларусі і просіць гэтых кіраўнікоў узбудзіць адміністрацыйную справу супраць прэзідэнта Лукашэнкі па артыкулу 167, частцы 2, за распальванне сацыяльнай нянавісці сярод беларускага народа, бо "збіццё дэпутатаў Вярхоўнага Савета 12-га склікання і дэманстрантаў, шматлікія парушэнні Канстытуцыі, грубая фальсіфікацыя вынікаў рэферэндуму ніколі не будуць забытыя. Аб інтэлекце А.Лукашэнкі гавораць яго выказванні: дэпутаты —"дармоеды", прадпрымальнікі — "вшивые блохи". Гэтыя словы гучаць публічна на ўсю рэспубліку!"

Рэакцыя мясцовай улады пакуль невядомая. Так, Генадзь Самойленка яшчэ раз ёй напомніў аб небяспецы, якая пагражае беларускай дэмакратыі (быццам бы яна існуе ў нас, гэтая дэмакратыя...).

Марына РАССАФОНАВА.

У люстэрку замежнага друку

Сцэнарый ёсць, але ці адбудзецца спектакль?

Як паведаміла інфармацыйнае агенцтва Інтэрфакс, расійскі палітык С.Шахрай упэўнены, што сёлетні год прадастаўляе унікальную магчымасць для аб'яднання Расіі і Беларусі, якой "у далейшым можа не быць вельмі доўга ці ўвогуле ніколі".

Тэлеканал "Вести" падкрэслівае, што расійскія палітыкі прапаноўваюць шматлікія варыянты далучэння Беларусі да Расіі, у тым ліку і не цалкам усю рэспубліку, а асобна — па абласцях.

Адзначым, што пры такім падыходзе знікае не толькі сама назва Беларусь, але і яе мова, культура і сама магчымасць калі-небудзь зноў аб'яднацца ў адно цэлае нават у межах Расійскай Федэрацыі.

Газета "Известия" (15 студзеня г.г.):

"Чаму замест узаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх эканомік нам прапаноўваюць зліць гэтыя эканомікі ў адну, што створыць дадатковыя цяжкасці для жыхароў Расіі? За гады ж праўлення Лукашэнкі беларуская эканоміка безнадзейна адстала ад нашай, рэформы ў рэспубліцы не зрушаны з мёртвай кропкі, зарплата нашмат ніжэй, чым у Расіі... У палітычным плане аб'яднанне з Беларуссю выкліча далучэнне да Расіі шасці новых абласцей "чырвонага пояса", і Генадзю Зюганаву застанецца толькі падзякаваць Ельцыну за такі падарунак да наступных выбараў...

Вядома, што Расіі такое аб'яднанне неабходнае перш за ўсё паводле стратэгічных меркаванняў і таксама па матывах нацыянальнага прэстыжу. Але навошта гэта Беларусі, прэзідэнт якой пакуль не выявіў жадання падзяліцца хоць з кім-небудзь уладай? Адказ просты: беларуская эканоміка ў такім стане, што без падтрымкі звонку справа можа закончыцца праз год галодным бунтам.

Газета "Сегодня" (15 студзеня г.г.):

У пасланні Ельцына аб стварэнні адзінай нарматыўнай базы, уніфікацыі заканадаўства і сінхронным увядзенні падатковага заканадаўства адзначаецца надзвычай рэзкі яго тон і зусім не характэрны для беларуска-расійскіх адносін змест эканамічных прапаноў Масквы. Усё гэта выглядае, як апошняе папярэджанне... Эканоміку Беларусі немагчыма ўпісаць у адзіную з Расіяй эканамічную прастору. Без хуткай прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў гаварыць пра нейкае аб'яднанне наогул бяссэнсава. Падобна на тое, што ў такой дыпламатычнай форме Расія прад'явіла беларускаму прэзідэнту ультыматум.

Радыё "Свабода":

Кіраўнік Кіеўскага цэнтра палітычных даследаванняў Міхаіл Пагрэбінскі мяркуе, што размовы аб магчымым аб'яднанні Беларусі і Расіі — гэта форма ціску на Захад у сувязі з пашырэннем НАТО, жаданне Расіі прадэманстраваць Еўропе сваю палітычную патэнцыю як вялікай дзяржавы.

На думку кіраўніка фонда падтрымкі бяспекі Украіны, былога аналітыка адміністрацыі прэзідэнта Віктара Небажэнкі, магчымае правядзенне рэферэндуму ў Расіі і Беларусі наконт аб'яднання — гэта сродак маральна-псіхалагічнага націску на Украіну, якая настойліва сцвярджае сваю незалежнасць і нацыянальны суверэнітэт. Зварот Ельцына — лагічны праця курсу Расіі на аднаўленне імперыі ў межах былога СССР.

Намеснік кіраўніка ўпраўлення адміністрацыі прэзідэнта Украіны Вадзім Далганаў адзначыў, што не варта драматызаваць сітуацыю. Расійская пазіцыя выразна імперскага характару можа мець для Украіны і пазітыўныя вынікі. Прэзідэнт Леанід Кучма меў сустрэчу з вядомым прадстаўніком амерыканскай эканамічнай і фінансавай эліты Джаферы Саксам, які ўжо ведаў пра расійска-беларускі спектакль на тэму аб'яднання. Заакіянскі ўплывовы госць запэўніў Кучму, што Амерыка гатова даць дадатковыя мільярды долараў для ўмацавання незалежнасці Украіны.

Падрыхтаваў Алесь ДРАБЧУК.

Анатолий Лебедько,
депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва

О власти, совести и чести

IV. Каждый сам себе режиссер

Нет диктаторов несвергаемых.
Есть — свергаемые слишком поздно

(Продолжение. Начало в № 6)

Тема белорусской государственности продолжает оставаться оселковым вопросом в наступившем году. Вокруг нее будет вращаться все: политика, экономика, интересы, деньги, народ, страна. Все ведущие доморощенные столоначальники, городничие, оппозиционеры будут сожительствовать с темой N 1 1997 года. Осознание этого помогает спрогнозировать возможный сценарий развития событий и поведение ветеранов политических подмостков.

Итак, насколько реальна ликвидация Беларуси как самостоятельного государства? Возможен ли аншлюс России белорусским президентом Лукашенко?

Ниточкой в этом запутанном клубке является выступление А.Лукашенко 13 ноября прошлого года в российской Государственной думе. Президент Беларуси сделал сильный политический ход, предложив парламентариям двух стран провести совместное заседание, на котором принять решение о политическом объединении России и Беларуси. Эта инициатива может стать той златорунной овцой, с которой при любом дальнейшем развитии событий Лукашенко сострижет свои политические дивиденды.

Катализируя вопрос политического объединения, президент Беларуси тем не менее как бы остается в стороне. Первое решение, оформленное как юридический документ, предлагается принять депутатам. И при скромных результатах единения или необходимости открутить вопрос назад всегда можно сослаться на роль законопослушного исполнителя воли народных избранников.

В случае же, если Государственная дума окажется в силу каких-то обстоятельств не готовой к практической реализации лукашенковской инициативы в первой половине 1997 года, Александр Григорьевич еще больше укрепляет свой имидж первого интегратора и объединителя славянских народов. Он получает возможность апеллировать к россиянам и находить у них понимание и сострадание. И чем ничтожнее будут результаты инициативы, тем величественнее и монументальнее будет фигура А.Лукашенко в глазах российского электората.

Говорить что-нибудь о влиянии на ход событий со стороны белорусской Палаты представителей просто неприлично — рожденный ползать летать не может.

Однако велика вероятность того, что интересы большинства думцев и Лукашенко пересекутся. Единым знаменателем может стать неприятие этого Б.Ельциным. В данном случае это шах Борису Николаевичу. У российского президента значительно сокращается поле для политического маневра. С идеей, овладевшей массами, нельзя не считаться. А это значит надо играть по правилам младшего брата. Конфедерация как переходная форма к единому государству приемлема для А.Лукашенко. Он приобретает легитимность на российских просторах и в политическом заезде сразу на корпус опережает "чистокровных политрысаков" Черномырдина, Зюганова, Лужкова и иже с ними. Столица Москва, Санкт-Петербург еще не матушка Россия. Российская же глубинка — Клондайк для А.Лукашенко. За несколько лет до выборов президента единой страны посеянные Александром Григорьевичем зерна дешевого популизма, рыночного социализма, простых решений больших проблем дадут отменные всходы.

В этих условиях желающих поставить на "белорусскую лошадку" будет немало. Уже сегодня Жириновский, Лебедь не прочь быть с Лукашенко в одной упряжке.

В политике, однако, каждый сам себе режиссер. Сценарий пишется не только в Минске, но и в златоглавой. То, что мерещится, чудится, прогнозируется, предвещается, совсем не обязательно воплощается в жизнь. Вышеначертанный сценарий был возможен в 1992—1993 гг. Сегодня Россия живет и играет по другим правилам.

Приход к власти в России политика типа "а ля Лукашенко" означает начало гражданского противостояния, более ужасного по своим последствиям, чем чеченская трагедия. Было бы наивно полагать, что сидящие у спецраспределителей, у труб и краников, с которых регулярно капает на персональные валютные счета, допустят новый масштабный передел сфер влияния, перераспределение собственности. Тем более что окружение белорусского президента доказало, что отбирать и делить — это едва ли не единственное, чем они овладели в совершенстве.

С другой стороны, в Российской Федерации не счесть партий, кланов, груп по интересам, которые не прочь использовать "белорусское чудо" в собственных целях. Несмотря на кажущуюся внешнюю разношерстность и неоднородность российских политических элит, есть то, что объединяет практически всех. Это желание сохранить от распада Российскую Федерацию, а значит, сохранить и себя. Нарастающие дезинтеграционные процессы может приостановить одна небольшая, победоносная война, война без сражений и крови. Мирно завоеванная Беларусь — хорошая компенсация за Чечню и мощный фактор психологического воздействия на регионы. И здесь А.Лукашенко со своими романтично-амбициозными претензиями на Кремль просто незаменим.



Президент Беларуси не может об этом не догадываться. По этой же причине и задумывался ноябрьский референдум как средство укрепления тыла в случае неудачного похода на Москву. Лукашенко — азартный игрок, он любит рисковать. Ему кажется, что в любой момент он сможет выйти из игры. И в этом он глубоко заблуждается. Бог с ним, с исчезновением Лукашенко-политика, но невосполнима потеря Беларуси как государства, исчезновение белорусов как нации.

В январе-феврале следует ожидать обострения внутриполитической борьбы между Б.Ельциным и Госдумой за право практической реализации идеи объединения России и Беларуси. Можно предположить, что команда Ельцина будет инициировать проведение референдума по этому вопросу. Российские думцы попытаются решить вопрос без дополнительных финансовых затрат и потери времени, предложив белорусским "ноябристам" готовый проект постановления о денонсации Беловежского соглашения и воссоздании союза на новой основе. При любом раскладе Лукашенко уготовлено быть подыгрывающим.

(Окончание на 4-й стр.)

"Чырвоныя" каля Чырвонага касцёла

З набліжэннем вясны некаторая частка грамадства прыкметна актывізавалася. Днямі каля Чырвонага касцёла св. Сымона і Алены ў Мінску сабраліся "чырвоныя".

Гэтую акцыю Камуністычная партыя Беларусі і "Движение за социальный прогресс и справедливость" прымеркавалі да трэцяй гадавіны з дня затрымання ў Мінску кіраўнікоў камуністычнай партыі Літвы М.Буракявічуса і І.Ермалавічуса. На думку старшыні ДСПС Леаніда Школьнікава, тое злачынства было здзейснена ў выніку дамовы асоб, якія займалі высокія пасады ў Беларусі і Літве. Між іншым удзельнікі пікета склалі заяву да Нацыянальнага сходу рэспублікі. У ёй, у прыватнасці, яны просяць прыняць і накіраваць у адрас Сейма Літоўскай Рэспублікі ліст з патрабаваннямі вызваліць Буракявічуса і Ермалавічуса. Так ужо зрабіла Дзяржаўная Дума Расіі. На яе і спасылаюцца кіраўнікі ДСПС і КПБ. Цікава: а як жа яшчэ магла павесці сябе ў гэтай сітуацыі "чырвоная" Дума?

Трэба дадаць, што пікет быў дазволены ўладамі, а 27 студзеня яго ўдзельнікі плануюць "ісці на літоўскую амбасаду".

Уладзіслава ЛЕНСКАЯ.

Светская хроника

Так гуляют в "Полифакте"

Если вы не катались на санях по бескрайнему снежному полю, не опрокидывали стопочку на самом верху действующей мельницы, не пробовали на морозце уху, копченых кур, шашлыки, блины, не водили с ряжеными хороводы вокруг большого костра, если мастера-умельцы не выковали вам подкову на счастье, а гончары не вылепили колокольчики — вы очень много потеряли. А ведь именно так на старый новый год в издательском центре "Полифакт" у Евгения Будинаса проходил фест старосветской культуры. В этот день деревню Дудутки почтили своим присутствием чрезвычайные и полномочные послы Великобритании, Республики Польша, Литовской Республики, Михаил Подгайный, руководитель Белорусской капеллы Виктор Скоробогатов, Элеонора Езерская и многие другие. Несмотря на то что более ста человек гостей провели на морозе почти целый день, холодно никому не было — согревались и у костра, и в хороводах, и "Двумя буслами", не говоря уже о действующем самогонном аппарате Дудуток.

У представителя посольства Федеративной Республики Германия из-за мороза в "Мерседесе" отказала электроника. И умельцы из "Полифакта" с помощью лезвия бритвы и фольги от пачки сигарет справились со сложной немецкой техникой. На аукционе подвыпившие гости из России приобрели керамическую бутыль с дудуткинским самогоном за 100 долларов, тогда как стартовая цена ее была 50 тысяч белорусских рублей. Гости же из Минска денег на ветер не бросали. Журналист "Имени" Ольга Улевич получила ценный приз — большой горшок меда.

Поздно вечером переполненные автобусы с подвыпившими гостями благополучно прибыли в Минск.

Анна СОУСЬ.

Каков привет – таков ответ

Заврались окончательно...

То, что государственные газеты врут на каждом шагу, — не секрет. Это подтверждает и публикация "Лидер тот, кто лидирует", помещенная в "Советской Белоруссии" за 16 января. До бесстыдства хвастаясь увеличением тиража "СБ" (хотя он и сегодня в полтора раза ниже, чем был шесть лет назад), некто Александр Федоров постарался "пройтись" по независимым газетам — смотрите, мол, какие у них малые подписные тиражи. А для этого понадобилось даже нагло соврать — количество подписчиков "Народной воли" по линии "Белпочты" и "Союзпечати" занижено, например, на шесть тысяч. А всего автор отминусовал нам значительно большее количество подписчиков. Зачем заметалинским "мастерам пера" знать, что "Народная воля" ведет подписку не только через подразделения "Белпочты" и "Союзпечати", но и через альтернативную негосударственную сеть.

Надеемся, читатели президентской газеты заметят и такую эквилибристику Александра Федорова. По "Советской Белоруссии" и другим государственным газетам он дает общие тиражи (с учетом розницы), по негосударственным изданиям — только подписные, да и то неполные. С какой целью? Как говорится, и козе понятно...

Не обольщайтесь, друзья-коллеги из пропрезидентских изданий, своими тиражами. Газета "Правда" когда-то также имела очень большой тираж.

Редакция газеты "Народная воля".

Народная Воля

18 СТУДЗЕНЯ 1997 г.

О власти, совести и чести

(Продолжение. Начало на 1-й стр.)

Уверен, что политики куда больше любят нитки нефте- и газопроводов, пролегших по белорусской земле, наши железнодорожные магистрали, приближающие на 600 км Калининградскую область, систему ПВО, нежели толерантный белорусский народ. Увы, это проза большой политики. Она лишена чувств и эмоций. Для обитателей Кремля национально-государственные интересы превыше любви к братскому народу.

Независимо от того, по какому сценарию будут развиваться дальнейшие события, и российский Белый дом и белорусский Красный дом не могут не учитывать, что сегодня в Республике Беларусь немало людей, для которых на первом месте в шкале приоритетов и ценностей стоят не материальные блага, не хлеб насущный, а такие понятия, как свобода, независимость, демократия. Количество этих людей достаточное, чтобы заставить считаться с их мнением любую власть.

Москва должна понимать, что любое разочарование от объединения может стать питательной средой для антироссийских настроений. Лучше иметь Беларусь суверенную, но братскую, дружественную, чем Беларусь, субъект Российской Федерации, но с лицом Ольстера.

Новый белорусский порядок

Беларусь — на пороге книги рекордов Гиннесса. В стране две Конституции: де-юре действует Конституция 1994 года, де-факто "работает" Конституция 1996 года. Часть населения живет по одним правилам, вторая — по другим. Для третьих, тех, кто на вершине власти, вообще не существует никаких правил. Создана правовая, морально-нравственная основа для проведения актов гражданского неповиновения. Спрашивается: почему граждане должны быть законопослушны по отношению к тем, кто грубо нарушил Конституцию? Почему налогоплательщики должны за свой счет содержать незаконные образования типа Национального собрания?

В стране два парламента. Легитимный, избранный народом Беларуси, признанный международным сообществом Верховный Совет 13-го созыва. И незаконное, по сути назначенное главой государства, отвергнутое международным сообществом Национальное собрание.

В республике два председателя Центризбиркома, два состава Конституционного суда. Правда, пока один президент. Временно. В 1999 году истекает срок полномочий Лукашенко, так что в полку президентов можно ждать прибавления.

Беларусь становится страной двойных стандартов. Люди по-разному вынуждены себя вести на работе, дома, в кругу знакомых. Стало небезопасно говорить то, что думаешь. Профессора, доктора наук, члена-корреспондента международных академий можно лишить права преподавания в государственном вузе только за то, что он политический оппонент власти. По тем же причинам человеку можно не давать предусмотренную законом пенсию или не выпускать его за границу. Для непризнающих легитимность "Конституции" введен запрет на профессию. Те, кто по-стахановски внедряет новоиспеченную "Конституцию" в жизнь, перепрыгивают несколько ступенек по служебной лестнице.

Политика двойных стандартов плюс дверной глазок, через который на каждого (24 часа в сутки) взирает государево око, — это и есть тот новый белорусский порядок, который рекламирует главный столоначальник страны. В нем причина того, почему народ безмолвствует, когда его унижают, обманывают, когда не соблюдают законность и разгоняют легитимные органы власти. И это особенно бросается в глаза в сравнении с Югославией, где нарушения власти кажутся детскими шалостями по сравнению с Беларусью. И тем не менее — штиль в белорусской столице и — мощные ежедневные митинги-стотысячники в Белграде на протяжении нескольких месяцев. Новый порядок производит нужную власти продукцию — страх и инертность. Продукцию, оказывающую огромное психологическое воздействие на людей.

Источник страха — едва ли не поголовная привязанность населения страны к государству, а точнее, госвертикали. Нет ни наивности, ни случайности в действиях Лукашенко, препятствующих проведению приватизации и массовому исходу способных, талантливых людей на свой хлеб. Не зависящие от госпайка — это совсем другие люди. Они по-иному живут, работают, думают, даже пьют горькую. Свободные, независимые, отягощенные материально-интеллектуальной собственностью люди требуют уважения к себе, к своим семьям, к закону. Им не безразлично, в какой стране они живут и кто ими правит. Они реально влияют на ситуацию в государстве.

Президент это понимает. И заявляя, что человек, работающий в государственных структурах, не может быть в оппозиции к власти, он выносит суровый приговор посмевшему нарушить это правило. Апеллировать не к кому. Справедливость можно искать у закона. У государя можно только просить милости и каяться в содеянном.

Новый порядок рождает "оппозицию кухни". Раскрепостившись за бутылкой самогона или французского коньяка (в зависимости от толщины кошелька), люди ропщут, матерят власть и грозят лишиться терпения, а завтра молча бредут в казенные кабинеты, к рабочему станку, к баранке автомобиля. Дитя неволи свободным быть не может.

Боязнемания у белорусов — это наследственное. Всю жизнь мы кого-то боимся — начальников, больших и малых, в пыжике и фуражке, буйного мужа, нервной вахтерши. Но не многие испугались предупреждений о пришествии диктатуры: не всколыхнулась, не забилась в судорогах интеллигенция; не возмутилась молодежь, нюхнувшая щепотку свободы; не дрогнул мускул на лице ветерана.

В условиях нового порядка невозможно вызвать прилив гнева и ненависти к тому, что длится десятилетия. Наша диктатура — ровесница Октября. Она лишь меняла форму в зависимости от персоналий, но суть ее оставалась неизменной.

Человек ко всему привыкает — к диктатуре, к бездорожью, к обвешиванию в магазине, к хорошей жизни по зарубежным телесериалам. Иногда кажется, что кризис — это наше естественное состояние. Только мы можем по-настоящему радоваться тому, что колбаса в гастрономе закончилась на нас, что сперли иномарку соседа, что к пенсии прибавили 70 тысяч, когда стоимость курицы стала 60 тысяч за килограмм.

Нам много не надо. Народ наш доверчив, сделать его своим несложно. Достаточно ему говорить то, что он хочет услышать. Кому неприятны лесть и комплименты! Алкоголику нравится, когда его называют здоровым. Лодырь, если нахваливать его золотые руки, иначе как трудоголиком себя не величает. Не имеющий ни кола ни двора, получив очередную телеинъекцию, мнит из себя хозяина, и обязательно всей страны. Презирающие белорусский язык возведены в ранг постпредов белорусской интеллигенции.

При таких оценочных категориях разве может быть народ здоровым? Власть, правда, на этом настаивает, утверждая, что итоги референдума не сфальсифицированы. Но простите, господа-товарищи, только пациент Фрейда мог голосовать против того, чтобы финансирование всех ветвей власти осуществлялось гласно, чтобы знать, куда и на что тратятся деньги налогоплательщиков.

О не очень высокой оценке собственного народа свидетельствуют заявления о стабильности как достижении властей. Причем стабильность трактуется до неприличия примитивно: нет автоматной пальбы и танков на улице. Товарищ президент, не увлекайтесь этим словом. Стабильность — это когда мясо круглый год, (все 365 дней) по одной цене, когда автобус приходит регулярно, а не по праздникам, когда зарплату выдают деньгами, а не кастрюлями и велосипедами, когда матери не тащат под кофточкой батон, чтобы накормить детей, когда бабка, скупающая по 1000 яиц, не способна парализовать работу всех птицефабрик страны.

Стабильность есть результат кропотливой работы, а не деклараций-заклинаний. Александр Григорьевич уверенно отвечает на извечный вопрос: "Кто виноват?" Националисты, демократы, банкиры, предприниматели, партии, профсоюзы, нечестные журналисты, Верховный Совет, НАТО, нездравомыслящие политики России, Европы... Гораздо сложнее у президента с ответом на вопрос: "Что делать?"

Пока же президент поглощен проблемой Кремля и рейтингом своей популярности. Для того чтобы последний был на соответствующем уровне, достаточно организовать шумный судебный процесс, усадив на скамью подсудимых ненавистных банкриров, бизнесменов, у кого лицо по шесть центнеров (цитата Александра Григорьевича — **А.Л.**), парочку министров, уголовников для остроты ощущений. За это шоу, представленное как начало серьезной борьбы с коррупцией, как торжество законности, электорат пуще прежнего будет любить президента.

Президентская команда, однако, допустила ряд серьезных просчетов и ошибок, последствия которых могут сказаться на "всенародной" любви к главе государства.

Проигнорировав общепризнанные в цивилизованном мире правила политической борьбы, грубо нарушив национальное законодательство, президент ликвидировал институт парламентаризма в Беларуси. Парламента, как единственного законодательного, высшего представительного, осуществляющего контроль за исполнением законодательства органа в республике, не существует. Более того, проигнорировав волю сотен тысяч избирателей, А.Лукашенко методом политической зачистки (широко применяемой в условиях "чеченской" войны) лишил оппозицию возможности полноправной парламентской работы.

Европа давно усвоила, что гораздо лучше, дешевле, эффективнее, когда идеологии борются, идеи конкурируют, аргументы спорят в стенах парламента, чем в уличных стенаниях и примитивном мордобое. Эту несложную политграмоту освоили в большинстве республик бывшего СССР. Можно представить последствия искусственного удаления партии Зюганова из Государственной думы?! Правительство только и занималось бы борьбой с емельянами и стеньками XX века.

В Беларуси президент провоцирует осложнение политической ситуации. Он вынуждает оппозицию брать на вооружение непарламентские формы политической борьбы. И дело не в жажде власти (в любви к ней вряд ли кто-то может составить серьезную конкуренцию Лукашенко), а в принципиально разных подходах к вопросам обустройства Беларуси, ее государственности, реформирования экономики.

Что произойдет, если еще за 2,5 года президенства А.Лукашенко все останется без изменений? Страна постепенно превратится в огромное Ходынское поле, на котором периодически будет появляться президент и раздавать милостыню. Льготные кредиты — президентской властью, свободу — президентской милостью, стипендии — из президентского фонда, квартиры — в президентском доме, должности — в президентской вертикали, шубы — с президентского плеча. И будет страшная давка. Более сильные и наглые будут топтать слабых и юродивых. Рекламируемый новый белорусский порядок — это дорога в рай, вымощенная человеческими телами и судьбами.

Вся страна станет в очередь к президенту. А в ней все такие похожие друг на друга. У всех одинаково преданно блестят глаза и одинаково нервно дрожат колени. Один великий кормчий. Один огромный собес. Одна большая очередь.

Есть ли еще большее унижение, стыд и позор сильному, свободолюбивому, образованному, совестливому стоять с протянутой рукой, лепетать слова благодарности, давить в себе Христа и взращивать Иуду.

Проблем действительно станет меньше. Не будет нездравомыслящих депутатов, неустанно твердящих о каких-то правах и свободах человека, коррупции и воровстве в органах власти, строптивого Конституционного суда, пугающего правовым Чернобылем, "пьяных" шахтеров, бродящих по весям Белой Ходынки; "нячэсных" журналистов, состоящих на довольствии у ЦРУ и Массада.

В новых учебниках по истории (если они успеют выйти в 1997 году) найдется место и "хлопковому делу" Карпенко, и "заговору" Гончара, Богданкевича.

Высшей государственной наградой станет знак "лиозненский стрелок". Его обладатели составят касту "настоящих новых белорусов". Один пастырь будет их благославлять на подвиги, другой отпускать грехи за содеянное. Начнут реализовываться программы, одобренные Всебелорусским собранием: жилищная — за счет подселения бесквартирных в коттеджи и на "излишки" жилплощади обитателей многоэтажек, и продовольственная — за счет приписок, привесов. На мясокомбинате тощие коровы будут идти, как быки повышенной упитанности. По данным Минстата, среднестатистический житель Беларуси будет съедать мяса и выпивать молока больше, чем хваленые голландцы.

А дальше?! Терпение — оно не бесконечно. Несложно уничтожить воздухоплавателей на спортивном шаре. Но нет такой СОИ, способной сбивать идеи. Можно арестовывать людей, распространяющих "Декларацию прав человека", но невозможно подвергнуть аресту мысли, веру людей.

Недавно десятилетний сын моего приятеля поведал о своем однокласснике, инициировавшем сбор подписей за отстранение от власти Лукашенко. Практически весь класс поддержал инициативу. По прошествии месяца желающих отозвать подписи не выявлено. Это, видимо, и есть самая мощная и самая перспективная оппозиция страны.

Даследуем праблему

"Снікерс" як сімвал прыватызацыі

Іван МАКАЛОВІЧ

Напярэдадні Новага года ў мінскім офісе Міжнароднай фінансавай карпарацыі адбылася сустрэча журналістаў з яе кіраўнікамі, якая была прысвечана вынікам 1996 года. У выступленні **кіраўніка праекта МФК "Малая прыватызацыя ў Беларусі" Эрыка Хауэла** і яго адказах на пытанні прадстаўнікоў прэсы, усплылі факты і вывады, якія маюць несумненную вартасць для разумення прыватызацыйнай праблемы. Прапаноўваю фрагменты гутаркі.

2. У якія рукі трапляе ўласнасць?

— Спадар Хауэл, як вы ацэньваеце вынікі 1996 года?

— Год аказаўся багатым на падзеі. Калі за першыя шэсць месяцаў праведзена 24 аўкцыёны і прададзена 38 аб'ектаў, дык у другім паўгоддзі ўжо 109 аб'ектаў змянілі сваіх гаспадароў, атрымалі даход у 3 разы большы. Важна і тое, што людзі бачаць: прыватызацыя — не такі страшны звер, як некаторыя малююць.

— Што гэтаму паспрыяла?

— Змены, якія былі ўнесены ў закон аб прыватызацыі. Пачалі зніжацца цэны на непрыцягальныя аб'екты. Калі які з іх не прадаецца на першым аўкцыёне, дык яна змяншаецца на 20 працэнтаў, а пасля другога — на 50 працэнтаў.

— Якія планы на 1997 год?

— Пашырэнне прыватызацыі. Мяркуецца падключыць Ваўкавыск, актывізаваць работу ў Гомелі. Варта было б хутчэй прыватызаваць уласнасць, здадзеную ў арэнду. Самае важнае ў тым, што ў 1997 годзе мяркуецца завяршыць прыватызацыю бытоўкі і гандлю.

— Ці праяўляюць інтарэс да нашай прыватызацыі замежныя фірмы?

— Мы працуем пакуль з малымі аб'ектамі. Для замежных фірм яны не ўяўляюць цікавасці.

— Што яшчэ неабходна, каб паскорыць важную справу?

— Актыўней паніжаць цэны на аб'екты, якія не прадаюцца на аўкцыёнах. Не трэба забываць, што найлепшая рэклама — нізкая пачатковая цана. Яна прыцягвае нямала ўдзельнікаў. Многае залежыць ад волі ўлад. Мы толькі дапамагаем і кансультуем. А рашэнні прымаюць яны.

— Калі параўнаць сітуацыю ў нас і іншых краінах СНД...

— Вядома ж, Беларусь не на першым месцы. Гэта не сакрэт. Я магу параўнаць з Казахстанам, дзе працаваў дагэтуль. Там і палітычная сітуацыя блізкая да вашай. Але там пайшлі і на буйную прыватызацыю. Хочацца спадзявацца, што і ў Беларусі рушаць да яе.

